# БІБЛІЯТЭКА — СЯРОД ЛЕПШЫХ

## Беларуская «нацыяналка» патрапіла ў рэйтынг самых прыгожых бібліятэк свету

**Нацыянальная бібліятэка Беларусі з часу сваёй пабудовы паспела стаць адным з галоўных сімвалаў нашай сталіцы, хоць стаўленне да гэтага будынка ў розных спецыялістаў не заўжды было адназначным. Зрэшты, у замежнікаў беларускі храм кнігі звычайна выклікае добрыя ўражанні. Нядаўна блогеры з партала Urban Times уключылі беларускую «нацыяналку» ў спіс 28 самых прыгожых бібліятэк у свеце. Там яна апынулася побач з такімі будынкамі, як Ватыканская апостальская бібліятэка, бібліятэка парламента Нідэрландаў, гарадская бібліятэка Штутгарта і іншымі. Карэспандэнт «Звязды» звязаўся з аўтарам гэтага матэрыялу і даведаўся, чым Нацыянальная бібліятэка Беларусі ўразіла блогераў.**



— У Беларусі я ніколі не была і бібліятэку «ўжывую» не бачыла, — расказвае **блогер Urban Times Раеса МУКТА.** — Калі рыхтавала свой рэйтынг, выпадкова патрапіла на фотаздымкі Нацыянальнай бібліятэкі ў Беларусі. Мая мэта — паказаць, што бібліятэкі могуць быць незвычайнымі як знутры, так і звонку. І мне падалося, што будынак у Мінску абсалютна адпавядае гэтаму крытэрыю, бо ён сапраўды ўнікальны.

СТАР. 2

# БІБЛІЯТЭКА — СЯРОД ЛЕПШЫХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— А што ў беларускай бібліятэцы ўразіла вас найбольш?**

— Яна выглядае вельмі сучасна. Акрамя таго, мае такую незвычайную форму. Часцей за ўсё ўстановы такога кшталту выглядаюць больш традыцыйна. Мне здаецца, што бібліятэкі з цягам часу ўсё менш і менш пачынаюць звязваць з кнігамі. Цяпер зручна працаваць з дакументамі і іншай інфармацыяй у лічбавым фармаце, а таму і эстэтычны аспект выходзіць на першы план. Людзям больш падабаецца працаваць і вучыцца там, дзе прыгожа, дзе ёсць увесь неабходны функцыянал. Я таксама ўздымаю тэму таго, што людзі ўсё менш карыстаюцца бібліятэкамі, не цікавяцца кнігамі. У Лондане шматлюдна толькі ў Брытанскай бібліятэцы і бібліятэцы Сената — вельмі прыгожых будынках, дзе знаходзяцца рэдкія кнігі і дакументы. Думаю, што ў Беларусі прыкладна такая ж сітуацыя.

**— Нядаўна іншы беларускі архітэктурны аб'ект патрапіў у падобны рэйтынг, толькі са знакам «мінус». Тэлеканал CNN уключыў у спіс самых непрыгожых помнікаў манумент «Мужнасць», які знаходзіцца ў Брэсцкай крэпасці, хоць пасля і папрасіў прабачэння...**

— Калі я ўпершыню ўбачыла гэты помнік, мне здалося, што ён сімвалізуе моц і гераізм. Думаю, што такая вялікая кампанія, як CNN, павяла сябе па-журналісцку некарэктна, калі вырашыла скласці такі спіс. Бо я ўпэўнена, што кожнаму чалавеку могуць падабацца і не падабацца розныя рэчы, — гэта справа густу. Але густ — не нагода ганьбіць чужыя каштоўнасці.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**